# ДЗЕНЬ МІНСКА

## АДКРЫТА БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАУНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЕНІ ЛЕНІНА

Аднавілі работу Дзяржаўная беларуская бібліятэка і Бібліяграфічны інстытут імені Леніна. Да вайны гэта былі самыя буйныя культурныя ўстановы рэспублікі. Тут налічвалася каля двух мільёнаў тамоў рознай літаратуры. Нямецкія варвары нанеслі бібліятэцы велізарныя страты. Яны разграбілі і спалілі каля 1,5 мільёна тамоў кніг.

Зараз кніжны фонд бібліятэкі хутка папаўняецца. З Масквы і Ленінграда для бібліятэкі імені Леніна адпраўлена 200 тысяч тамоў. Бібліятэцы вяртаецца шэсць вагонаў належачай ёй літаратуры, захопленай Чырвонай Арміяй у ліку іншых трафеяў у гітлераўскіх грабежнікаў.